ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
9
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 14 (1314)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### ПА КАНФЕРЭНЦЫІ

геаграфічнага факультэта і геаграфічнага таварыства БССР, прысвечанай XXVI з'езду КПСС, з дакладам «Знешняя палітыка КПСС» выступіў кандыдат геаграфічных навук В. М. Яцухна. Аб задачах эканамічнай і фізічнай геаграфіі, вызначаных рашэннямі партыйнага з'езда, расказалі прафесар І. І. Трухан і дацэнт С. М. Зубаў.

Поспехамі ў справе падрыхтоўкі географаў у БДУ падзяліўся дэкан факультэта прафесар М. Т. Рамано ўскі. На канферэнцыі выступілі прафесар В. А. Жучкевіч, кандыдаты навук В. І. Шабанава і М. П. Хаміцкі, дацэнт В. Я. Крышчановіч.

А. ЛАЗОЎСКІ.

### ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

навуковага савета адбылося ў НДІ фізіка-хімічных праблем. На ім з дакладам «Аб павышэнні якасці навукова-даследчых работ у XI пяцігодцы ў святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ» выступіў дырэктар інстытута, член-карэспандэнт АН БССР В. В. Свірыдаў.

А. СЯМЕШКА,
вучоны сакратар НДІ ФХП.

### 60-ГАДОВАМУ ЮБІЛЕЮ

нашага універсітэта прысвячаўся агляд мастацкай самадзейнасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ. Журы пад старшынствам дацэнта кансерваторыі Л. П. Івашкова аднадушна прысудзіла першае месца калектыву фізічнага факультэта, на другім — радыёфізікі, трэцяе месца занялі аматары самадзейнасці хімфака сумесна з НДІ ФХП.

Г. МАРЦІНКЕВІЧ,
старшыня культурна-масавай камісіі мясцкома.

### У АГЛЯДЗЕ

студэнцкіх вакальна-інструментальных ансамбляў БДУ лепшым быў ансамбль хімфака. Ён адрозніваўся ад астатніх самабытнасцю і арыгінальнасцю аранжыровак. Кіруе творчым калектывам студэнт IV курса В. Кобец.

Л. БАРАНОЎСКАЯ,
інструктар студэнцкага клуба.

### ДРУГІ ТУР

гарадскога агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці замежных студэнтаў быў праведзены ў актавай зале філфака. Лепшымі сярод універсітэцкіх выканаўцаў сталі: першакурсніца мехмата, в'етнамская студэнтка Май Тхі Тхо, а таксама квартэт мадагаскарцаў і ансамбль палітычнай песні студэнтаў-фізікаў з ГДР.

А. СУРКОВА,
інспектар дэканата па рабоце з замежнымі студэнтамі.



У студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі універсітэта прайшла зверка дакументаў. Высокім узроўнем яе правядзення вызначыліся біялагічны, юрыдычны, механіка-матэматычны факультэты.

НА ЗДЫМКУ: член арганізацыйна-масавай камісіі прафкома Наталля Забермах вядзе зверку з прафоргамі Т. Вяцкай (3 курс, першая група журфака і Л. Падаляк (4 курс, група паўправаднікоў хімфака).

Фота В. ШАЧАКА.

**Студэнт І курса факультэта журналістыкі СЕСЕЙ ДЖОН БАКАР прымаў удзел у рабоце XXVI з'езда КПСС у якасці карэспандэнта тэлебачання, радыё і газет Рэспублікі Сьера-Леоне. Сёння ён дзеліцца сваімі ўражаннямі аб гістарычным форуме савецкіх камуністаў.**

## З'ЕЗД МІРУ І ДРУЖБЫ

З'ЕЗД Камуністычнай партыі Савецкага Саюза — падзея гістарычнай важнасці. Ён адбыўся ў той час, калі імперыялістычныя краіны на чале з ЗША апраўдваюць гонку ўзбраенняў надуманай пагрозай з боку СССР і краін сацыялістычнай садружнасці, нападаюць на міралюбівую знешнюю палітыку Савецкага Саюза.

Ды толькі нельга зрабіць праўдай хлусню, выдаць жаданае за рэальнае. Прагрэсіўнае чалавецтва з надзеяй і задавальненнем сочыць за міралюбівай палітыкай Савецкай дзяржавы і яе авангарда — Камуністычнай партыі,— накіраванную на падтрымку справядлівай барацьбы прыгнечаных народаў супраць каланіялізму, за нацыянальную незалежнасць, дэмакратыю, сацыяльны прагрэс, за мір ва ўсім свеце.

Менавіта аб гэтым гаварылі ў сваім выступленні кіраўнік нашай дэлегацыі, віцэ-прэзідэнт Рэспублікі Сьера-Леоне К. А. Камера-Тэйлар. Ён запэўніў з'езд, што народ Сьера-Леоне будзе і ў далейшым падтрымліваць мірныя ініцыятывы Савецкага Саюза, выступаць за мірнае суіснаванне краін з розным грамадска - палітычным ладам.

У перапынках паміж работай з'езда наша дэлегацыя наведала аўтамабільны завод імя Ліхачова (ЗІЛ), ВДНГ СССР, Алімпійскі комплекс; пабывала ў гасцях у студэнтаў МДУ імя М. В. Ламаносава і універсітэта Дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы; усклала вянкі да Маўзалея У. І. Леніна і на магілу Невядомага салдата. Запомнілася тая шчырасць і цеплыня, з якой сустракалі нас савецкія таварышы, атмасфера дружбы і ўзаемаразумення. Гэта былі незабыўныя хвіліны.

XXVI з'езд КПСС — з'езд міру і дружбы, форум вялікіх планаў і здзяйсненняў. Яго рашэннямі жывуць сёння савецкія людзі, ён — новая старонка ў адносінах паміж краінамі, якім дарагія мір і сацыяльны прагрэс.

## Натхнёная праца

БАЙЦЫ зводнага студэнцкага будаўнічага атрада фізфака, выконваючы рашэнні XXVI з'езда КПСС, лічаць сваёй галоўнай задачай выдатную падрыхтоўку да трэцяга працоўнага семестра. На факультэце ўзгарагы сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую камсамольскую арганізацыю па падрыхтоўцы будаўнічых атрадаў і на лепшы лінейны СБА.

Студэнты - камуністы, выдатнікі вучобы, камсамольскія актывісты, ветэраны будаўнічага руху складаюць касцяк атрадаў. На іх раўняюцца ўсе байцы. Да ўдзелу ў працоўным семестры-81 шырока прыцягнуты замежныя студэнты. На факультэце фарміруюцца два інтэрнацыянальныя атрады. Акрамя таго, частка студэнтаў будзе працаваць у зводным інтэратрадзе, месца дыслакацыі якога — Усць-Ілімск.

Мы імкнёмся, каб сярэдні бал байцоў кожнага будатрада ў летнюю сесію быў не менш за «4». Актуальным застаўся дэвіз мінулых гадоў: «На студэнцкую будоўлю — без адзінай тройкі».

У саставу ўсіх лінейных атрадаў залічаны ганаровыя байцы. Студэнты ў час падрыхтоўчага перыяду збіраюць і афармляюць матэрыялы аб іх жыцці і дзейнасці.

Рыхтуючыся да сустрэчы 60-годдзя Белдзяржуніверсітэта, байцы СБА дапамагаюць у пошукавай рабоце універсітэцкай групе «Доўг».

Мы прымаем актыўны ўдзел у экспедыцыі «Мая Радзіма — СССР». Гэтаму дапамагае шырокая геаграфія дыслакацыі студэнцкіх будаўнічых атрадаў: Карэлія і Стаўрапальскі край, Казахстан і Пскоўшчына, Мінская і Віцебская вобласці нашай рэспублікі. І ўсюды 15 факультэцкіх СБА будуць працаваць пад дэвізам «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!».

І. НІЧЫПАР,
студэнтка фізфака.

СТУДЭНЦКАЕ СВЯТА

## ЯГО ВЯЛІКАСЦЬ МЕДЫУМ

ДЗЕНЬ 1 красавіка на факультэце журналістыкі быў адзначаны не толькі прыходам Дня смеху і пераводам гадзіннікаў. З першымі промнямі сонца на журфак прыйшоў яго вялікасць Медыум, якога з нецярплівасцю чакалі, да якога рыхтаваліся. І вось ён прыйшоў. Велізарных памераў фотагазета пад назвай «Дакацілі-ся...», музыка, песні, госці і сярод усяго гэтага — усхваляваныя, заклапочаныя твары імяніннікаў — студэнтаў III курса.

Цікавую і разнастайную праграму падрыхтавалі трэцякурснікі. Яна ўяўляла сабой некальк і тэлевізійных перадач. Гэта і «Памяць» — успаміны аб паступленні на факультэт, і «Міжнародная панарама» — выступленні замежных студэнтаў, якія займаюцца на журфаку, і інш.

З праграмай-віншаваннем выступілі студэнты III курса факультэта журналістыкі Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Шаўчэнкі, якія былі запрошаны на медыум. Позна вечарам патухла святло на факультэце, закончылася свята. Але ўражанні ад яго застануцца надоўга.

Т. ЕРМАЛАЕВА,
студэнтка журфака.

## Кліча «Чырвоная субота»

ШЫРОКА вядзецца падрыхтоўка да Ленінскага камуністычнага суботніка ва універсітэце. Створаны штаб па яго падрыхтоўцы і правядзенню пад кіраўніцтвам прарэктара В. Г. Ціхіні. У састаў штаба ўваходзяць прадстаўнікі усіх факультэтаў і падраздзяленняў БДУ.

Суботнік праходзіць у некальк і этапаў. Пачаткам першых працоўных дэсантаў стала чацвертае сакавіка. Дарожна-эксплуатацыйны участак Маскоўскага раёна, жылы дом па вуліцы Кузнечнай, добраўпарадкаванне праспекта «Праўды», інтэрнаты і вучэбныя карпусы універсітэта — асноўныя аб'екты ўдзельнікаў суботніка.

А. ШЫБУТ.

СТУДЭНТЫ 80-х

**На пытанне: «Чаму выбрана менавіта хімія?» Света Каліннікава, студэнтка III курса шостай групы хімфака, спачатку пажартавала—«Ды проста іншых экзаменаў не здала б», а потым сур'ёзна сказала: «Я вельмі люблю гэтую навуку. Калі ж паступіла, то вырашыла ісці на педагагічны паток...»**

**Святлана выдатна вучыцца. Яна выбрана камсоргам групы. Працавітасць і самааддача дапамагаюць спалучаць вучобу і грамадскую работу.**

**С. ТРУСЕВІЧ.**

Фота аўтара.



ІМЯННЫ СТЫПЕНДЫЯТ

# НЕ ДАЙ ДУШЫ СВАЁЙ АСТЫЦЬ

Ідучы на філалагічны факультэт, мы ведалі пра сваю будучую гераіню толькі адно: яна — імянная стыпендыятка, атрымлівае стыпендыю імя Якуба Коласа.

Празвінеў званок. Пытаемся, як знайсці чацвёртакурсніцу Алену Лісоўскую. У многагалоссі студэнцкага перапынку яе прозвішча рэхам пранеслася па калідоры. Да нас падышла высокая дзяўчына.

**— Лена, у недалёкай будучыні ты — настаўніца рускай мовы і літаратуры. Дзе хацела б працаваць?**

— Зразумела, у школе.

**— У Мінску?**

— Мне больш да спадобы невялікі горад або ціхая вёсачка, дзе амаль усе жыхары знаёмы паміж сабой. Але калі б была магчымасць выбіраць, не задумваючыся, паехала б у свой родны Дзяржынск.

**— Што зрабіла найбольшы ўплыў на выбар тваёй прафесіі?**

— Мой адказ не будзе арыгінальным: школа, урокі рускай мовы і літаратуры, на якіх у нас ніколі не было абыякавых, настаўніца, што навучыла роздуму над мастацкім словам, дапамагла ўважліва ўглядзецца ў захапляючы свет літаратуры.

**— А на каго з цяперашніх сваіх выкладчыкаў ты хацела б быць падобнай у сваёй самастойнай рабоце?**

— Не проста адказаць адразу. Вельмі добрыя ўспаміны засталіся аб майстэрстве Уладзіміра Аляксандравіча Карпава, які выкладаў нам на малодшых курсах уводзіны ў мовазнаўства і балгарскую мову. Зачаравала Ларыса Лявонцьеўна Кароткая, калі чытала курс старажытнай рускай літаратуры. Але найбольш прывабным мне здаецца прафесіяналізм Ірыны Сцяпанаўны Скарапанавай. Яе лекцыі па гісторыі рускай савецкай літаратуры захапляюць яркай, глыбокай эмацыянальнасцю, выразнасцю і змястоўнасцю. А непадражальнай манеры даносіць матэрыял да кожнага слухача можна толькі шчыра пазайздросціць.

**— Што дае вучоба на філфаку?**

— Глыбокае знаёмства з творамі класікаў і сучасных пісьменнікаў. Мы пазнаём ролю слова і мовы ў мастацкай літаратуры. Вучымся крытычна ацэньваць прачытаныя творы, выпрацоўваць свой погляд і мастацкі густ. Гэтаму дапамагаюць і сустрэчы з вядомымі беларускімі пісьменнікамі, якія часта арганізуюцца на нашым факультэце.

**— Лена, а як ты праводзіш свой вольны час?**

— Спяваю ў хоры. Па чацвяргах хаджу ў кіно. Не прапускаю хакей і фігурнае катанне па тэлевізару. Шмат часу забірае грамадская работа. Я — намеснік старшыні студэнцкага навуковага савета факультэта.

**— Якія якасці павінны быць у сучаснага педагога?**

— Ён павінен ісці ў нагу з часам і знаходзіць у сваёй рабоце натхненне. Любіць дзяцей і адчуваць свой вялікі абавязак перад імі.

**— І апошняе: што ты больш за ўсё цэніш у людзях?**

— Дабрату, розум, пачуццё гумару.

**Інтэрв'ю правялі Т. ГІЛЕВІЧ, Б. ЯРОШКА.**

ВЕЧАР АДНАГО ВЕРША

# Алмаз беларускай мовы

ІМЯ НАРОДНАГА паэта Беларусі Янкі Купалы шырока вядома не толькі сярод народаў неабсяжнай нашай Радзімы, але і за мяжой. Яго творы перакладзены на многія мовы і ўвайшлі ў скарбонку сусветнай літаратуры. Надыходзячаму стагоддзю з дня нараджэння нашага песняра быў прысвечаны вечар аднаго верша Янкі Купалы.

«А хто там ідзе?» — паваротны пункт у станаўленні беларускай літаратуры, гімн народа, які ўзнімаўся на барацьбу», — сказаў каля трыццаці гадоў назад французскі паэт Луі Арагон. Гэта выказванне яскрава сведчыць аб той велізарнай цікавасці, якую праяўляюць народы свету да творчасці народнага паэта Беларусі.

У светлай купалаўскай аўдыторыі філфака БДУ імя У. І. Леніна сабраліся студэнты, выкладчыкі — усе, хто любіць неўміручае слова вялікага песняра. Вечар адкрыў кандыдат філалагічных навук В. П. Рагойша. Ён расказаў пра творчасць Я. Купалы і пра кнігу перакладаў верша «А хто там ідзе?» на 75 моў свету, якая рыхтуецца да выхаду ў наступным годзе.

Пасля ўступнага слова верш «А хто там ідзе?» на рускай, украінскай, літоўскай, латышскай, грузінскай і іншых мовах народаў Савецкага Саюза чыталі члены літаратурнага гуртка філфака студэнты І. Кобель, Г. Дзямешчык, А. Малахоў, Н. Маркоўская, У. Мчатлідзэ і іншыя. З вялікім задавальненнем і цікавасцю слухалі прысутныя беларускі верш па-англійску, па-французску, а таксама на нямецкай, арабскай і польскай мовах.

Аспірант кафедры рускай мовы Ханойскага універсітэта Лыонг Він Тхінь разам са сваімі землякамі, якія вучацца ў нашай сталіцы, зрабіў выдатныя пераклады верша «А хто там ідзе?» на в'етнамскую, кхмерскую, лаоскую мовы, якія таксама гучалі на гэтым вечары.

У заключэнне пляменніца Я. Купалы Ядвіга Юліянаўна Рамаsuccessful Раманоўская шчыра і сардэчна падзякавала ўсім за прыемныя ўспаміны пра Я. Купалу, падарыла студэнтам і выкладчыкам фотакарткі паэта, яго кнігі.

Вечар перакладаў верша «А хто там ідзе?» — яшчэ адна старонка ўспамінаў пра Янку Купалу, дзе паэт паўстаў перад намі як палымяны патрыёт сваёй Радзімы.

**С. ЧЫГРЫН, студэнт філфака.**

# Сардэчна віншуем!

Дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара эканамічных навук паспяхова абараніў у сакавіку гэтага года ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце дацэнт кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў Белдзяржуніверсітэта **Уладзімір Андрэевіч КУЛАЖАНКА.**

Тэма дысертацыі — «Эканамічныя ўмовы аднаўлення асноўных фондаў сельскай гаспадаркі ў аграпрамысловым комплексе». Некаторыя вынікі гэтага даследавання выкарыстаны ў гаспадарках Слуцкага і Маларыцкага раёнаў.

* * *

**Кандыдацкія дысертацыі ў першым квартале 1981 года абаранілі:**

**Г. П. РАЗМЫСЛОВІЧ**, факультэт прыкладной матэматыкі, кафедра тэорыі верагоднасцей і матэматычнай статыстыкі (навуковы кіраўнік прафесар Р. Ф. Габасаў).

**Э. С. ШПІГЕЛЬМАН**, факультэт прыкладной матэматыкі, кафедра тэорыі верагоднасцей і матэматычнай статыстыкі (навуковы кіраўнік прафесар Ю. С. Багданаў).

**Н. В. ПЫЖКОВА**, факультэт прыкладной матэматыкі, кафедра вышэйшай матэматыкі (навуковы кіраўнік прафесар Ю. С. Багданаў).

**В. А. СОСЕНКА**, фізічны факультэт, кафедра ядзернай фізікі (навуковы кіраўнік прафесар С. С. Шушкевіч).

**У. А. ЧУДАКОЎ**, фізічны факультэт, кафедра ядзернай фізікі (навуковы кіраўнік прафесар С. С. Шушкевіч).

**В. М. ПІСАРАЎ**, гістарычны факультэт, кафедра новай і навейшай гісторыі (навуковы кіраўнік прафесар Л. М. Шнеерсон).

Жадаем далейшых творчых поспехаў, натхнення, паважаныя таварышы!

ІНТЭРВ'Ю З АДСТАЮЧАЙ ГРУПАЙ

# ПЕРАМАГЧЫ АБЫЯКАВАСЦЬ

**Калі ў камітэце камсамола і ў дэканаце фізфака вызначыць лепшую па ўсіх паказчыках групу факультэта было справай нялёгкай — у многіх групах і паспяховасць, і наведванне заняткаў, і вынікі грамадска-палітычнай практыкі добрыя,—то горшую і тут, і там назвалі адразу ж: дзевятая група першага курса. І, характарызуючы яе, дэкан факультэта Э. М. Шпілеўскі і яго намеснік А. А. Чупрыгін назвалі некалькі фактаў, якія, па праўдзе кажучы, уразілі мяне. Вынікі апошняй сесіі, якая была для студэнтаў гэтай групы першай, аказаліся самымі несуцяшальнымі. З 26 чалавек— 12 «хвасцістаў», толькі трое студэнтаў здалі сесію на «4» і «5», ніводнага выдатніка. Дваіх выключылі з універсітэта, двое пакінулі факультэт па ўласнаму жаданню. З 72 экзаменацыйных адзнак групы—48 «здавальняючых» і «нездавальняючых». Даўно не было такога на фізфаку, факультэце, які ў апошнія гады па праву займае прызавыя месцы ў сацыялістычным спаборніцтве. У чым жа справа? Разабрацца ў прычынах становішча, у якім апынуліся першакурснікі, мне дапамагаюць выкладчыкі факультэта, студэнты групы.**

**Андрэй ПІСАРЧЫК, камсорг:**

— Большасць членаў нашай групы — учарашнія школьнікі. І не ўсе яшчэ навучыліся працаваць самастойна. А калі хтосьці не хоча гэтага, то не дапамогуць тут ні гутаркі аб тым, як весці канспект, ні ўшчуванні сяброў. Не аднойчы прыходзілася сутыкацца з такім фактам: адкрывае студэнт падручнік, бачыць перад сабой незразумелыя тэрміны, цяжказапамінальныя формулы і закрывае яго. Пакапацца ў дадатковай літаратуры, дабрацца да сутнасці справы не хапае цярпення. А з гэтага і пачынаецца абыякавасць да вучобы. Многія яшчэ не адчуваюць розніцы паміж школай і факультэтам, выдзяляюць на падрыхтоўку да практычных заняткаў мала часу.

**Тамара ДРЫЛЁНАК, стараста:**

— А я лічу, што так званы перыяд адаптацыі ў нас ужо прайшоў. Пры жаданні мы змаглі б вучыцца значна лепш. Толькі патрэбна перамагчы ў сабе абыякавасць. Пропускаў заняткаў у групе параўнальна нямнога, але ёсць яшчэ такія, хто прысутнічаючы на лекцыі, у думках знаходзіцца далёка ад студэнцкай аўдыторыі. Чым хутчэй мы адмовімся ад такіх адносін да вучобы, тым хутчэй зможам ліквідаваць адставанне. Гэта магчыма. Патрэбна толькі ўсім захацець гэтага.

**Аляксандр ГОРБАЧ, прафгрупорг:**

— Мне хочацца сказаць аб тым, што за мінулыя шэсць месяцаў вучобы адзіным нашым дарадчыкам, памочнікам і сябрам была Іна Уладзіміраўна Якіменка, наш куратар. А вось з боку камітэта камсамола, студэнцкага прафбюро факультэта ніякай дапамогі мы не адчувалі, ды і цяпер не бачым. Толькі нядаўна мы даведаліся аб існаванні савета выдатнікаў, які быццам бы створаны для дапамогі першакурснікам. А калі б з самага пачатку нас уводзілі ў курс факультэцкага жыцця, то, магчыма, не была б лічба 3,1 сярэднім балам нашай першай сесіі.

**Каментарый куратара групы І. У. ЯКІМЕНКІ:**

*— А мне ўсё ж здаецца, што група не такая ўжо і благая. Калі паглядзець у атэстаты студэнтаў, то бачна, што толькі трое з іх маюць сярэдні бал 3,5, астатнія — 4—4,5 бала. Ёсць і медалісты. Проста, напэўна, не змаглі яны адразу пасля школы перамяніць свае адносіны да вучобы, актывізаваць свае намаганні на больш значнае, галоўнае. Ды і нельга гаварыць, што група наогул адстаючая. Так, добра займаюцца Люда Дзеражун, Сяргей Іалоп, Ірына Белавусава, крыху палепшыліся адносіны да вучобы ў Наташы Ярашэвіч, Антаніны Сташонак, Вольгі Краўцовай. Вось толькі выклікаюць трывогу Мікалай Абдурахманаў, Вадзім Дзяжураў, Леанід Шэпелеў. Ім яшчэ патрэбна працаваць ды працаваць. А наогул жа ў параўнанні з мінулым семестрам адчуваюцца некаторыя зрухі ў лепшы бок. Студэнты настроены аптымістычна, сталі больш патрабавальнымі да сябе і сяброў.*

**І намесніка дэкана А. А. ЧУПРЫГІНА:**

*— Так, група слабаватая. Гэта стала зразумела адразу ж пасля ўступных экзаменаў. Сярэдні праходны бал склаў 16—16,5 бала. Семнаццаць абітурыентаў залічаны на першы курс з адной-дзвюма тройкамі. Па сутнасці, на педагагічны паток прымалі нават без конкурсу. Залічвалі мы такіх людзей на факультэт з надзеяй на тое, што будуць яны з усёй сур'ёзнасцю адносіцца да вучобы; з упэўненасцю ў тое, што яны хочуць вучыцца і могуць вучыцца.*

*Прайшло некалькі месяцаў. У студэнтаў групы ўсё часцей сталі паяўляцца нездавальняючыя адзнакі. На адной з нарад куратараў, дзе падводзіліся вынікі паспяховасці, было адзначана, што займаюцца студэнты ніжэй сваіх магчымасцей. Толькі тады ўсур'ёз затурбаваліся становішчам групы. Былі і характарыстыкі кожнага студэнта, і персанальныя гутаркі з дэканам. Гаварылі ў асноўным пра тых, хто выклікае асаблівую трывогу. Гэтыя мерапрыемствы нейкім чынам дапамаглі—некаторыя са слабейшых падцягнуліся, задумаліся. Але вынікі зімовай сесіі паказалі, што яшчэ недастаткова ўвагі ўдзялялася гэтай групе.*

**Да наступнай сесіі засталося не так ужо і многа часу. Якой будзе яна для першакурснікаў дзевятай групы — мерканне пакуль што рана. Хочацца толькі напомніць камітэту камсамола, прафбюро факультэта аб тым, што іх малодшыя сябры чакаюць ад іх дзейснай дапамогі.**

**В. САБАЛЕЎСКІ, наш спец. кар.**

ГЭТА НАША З ТАБОЙ БІЯГРАФІЯ

# ВУЧОБА І ПРАЦА РАЗАМ ІДУЦЬ

У КОЖНАГА пакалення савецкага студэнцтва былі свае, вызначаныя часам, першачарговыя справы і клопаты. І на ўсіх этапах гісторыі нашай краіны выхаванне моладзі ў працэсе працоўнай дзейнасці камсамол разглядаў як адзін з галоўных напрамкаў сваёй работы.

У сярэдзіне 50-х гадоў грамадзянская і палітычная сталасць студэнтаў універсітэта знайшла сваё яркае праяўленне ў працоўных акцыях на цалінных землях. У адказ на рашэнне пленума ЦК ВЛКСМ (ліпень 1956 г.) аб накіраванні добраахвотнікаў з ліку вузаўскай моладзі ў саўгасы Казахскай ССР 264 студэнты універсітэта ў час летніх канікулаў адправіліся ў Кустанайскую вобласць. Ударная праца камсамольцаў была высока адзначана. 247 чалавек былі ўзнагароджаны граматамі і значкамі ЦК ВЛКСМ «За асваенне цалінных земляў», граматамі Кустанайскага абкома і Камышынскага райкома камсамола.

Імкненне універсітэцкай моладзі быць на пярэднім краі барацьбы за цалінны хлеб, там, дзе цяжка, выразна праявілася ў хуткім росце колькасці студэнтаў-цаліннікаў. У 1957 годзе 497, а ў 1958 ужо 650 камсамольцаў БДУ імя У. І. Леніна выехала на ўборку ўраджаю. У вольны ад работы час студэнты будавалі жылыя дамы, жывёлагадоўчыя памяшканні, майстэрні, гаражы. Значны аб'ём будаўнічых работ у 1958 годзе выканалі будучыя гісторыкі і географы ў зернесаўгасе «Цалінны» Какчэтаўскай вобласці.

Радкі, якія ўпісалі камсамольцы універсітэта ў летапіс гераічнай барацьбы савецкага народа за асваенне цалінных і абложных зямель, удзел юнакоў і дзяўчат ва ўнутрывузаўскім будаўніцтве, сезонных сельскагаспадарчых работах і іншых працоўных акцыях з'явіліся асновай для пераходу да новых форм працоўнага руху студэнцтва, расшырэння сферы прыкладання намаганняў моладзі.

1960 год. Працоўнымі падарункамі сустрэлі 40-гадовы юбілей ЛКСМ Беларусі камсамольцы універсітэта. 200 пасланцоў камсамольскай арганізацыі Белдзяржуніверсітэта працавалі на асушэнні балот у Любанскім раёне, 100 чалавек — на будаўніцтве горада Салігорска, 200 чалавек — на будаўніцтве газаправода «Дашава—Мінск». Студэнцкія будаўнічыя брыгады працавалі на важнейшых аб'ектах рэспублікі на працягу 30 і больш дзён, праводзілі значную грамадска-палітычную работу.

Вопыт, які назапасіла камсамольская арганізацыя БДУ імя У. І. Леніна ў арганізацыі работы студэнцкіх будаўнічых брыгад, вопыт дзейнасці першых студэнцкіх будаўнічых атрадаў краіны дазволіў камітэту камсамола універсітэта перайсці ў 1963 годзе на якасна новы этап падрыхтоўкі студэнтаў да летняга працоўнага семестра.

ВЯСНОЙ 1963 года пры камітэце ЛКСМБ быў створаны штаб працоўных спраў, які пачаў камплектаванне і падрыхтоўку студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта да выезду ў Уральскую вобласць. У атрадах былі створаны партыйныя групы і пазастатусавыя камсамольскія арганізацыі, выбраны рэдкалегіі насценгазет, створаны калектывы мастацкай самадзейнасці, укамплектаваны спартыўныя каманды. Байцы СБА, якія не мелі будаўнічых спецыяльнасцей, прайшлі навучанне на базе будтрэста № 5 г. Мінска.

15 мая 1963 года на пасяджэнні бюро камітэта камсамола і штаба працоўных спраў былі зацверджаны камандзіры першых студэнцкіх будаўнічых атрадаў — К. Сучкоў, В. Лаўруковіч, В. Стражаў, В. Чумакоў. У саставе лінейных СБА, якія выязджалі ў саўгасы «Стэпавы», «Ульянаўскі», «Пермскі», імя М. В. Фрунзе Уральскай вобласці, былі студэнты фізічнага, юрыдычнага, гістарычнага, матэматычнага, хімічнага і фізічнага факультэтаў.

Студэнцкія будаўнічыя атрады хутка заваявалі папулярнасць. Калі ў 1963 годзе ў цалінны край паехала 250 чалавек, то ў 1965 годзе ва універсітэце было сфарміравана 8 атрадаў агульнай колькасцю 410 чалавек.

15 чэрвеня 1965 года. На пероне чыгуначнага вакзала ажыўленасць, гучаць вясёлыя студэнцкія песні. Затым—мітынг. Заслужаны будаўнік БССР, Герой Сацыялістычнай Працы С. І. Ярашэвіч уручае камандзіру раённага атрада студэнтаў-цалліннікаў Васілю Чумакову падарунак — цаглiну, якая будзе закладзена ў фундамент першай цаліннай новабудоўлі. Байцы СБА запэўнілі, што студэнты-цалліннікі зробяць усё неабходнае, каб апраўдаць давер партыі і народа.

І рабяты не падвялі. Яны значна перавыканалі сацыялістычныя абавязацельствы па асваенню капітальных укладанняў, на грамадскіх асновах адрамантавалі 10 школ, праводзілі нядзельнікі па добраўпарадкаванню стадыёнаў і спартыўных пляцовак, выступалі перад сельскімі працаўнікамі з лекцыямі і канцэртамі. У пісьме, накіраваным у рэктарат БДУ імя У. І. Леніна, Чапаеўскі РК КП Казахстана, райвыканком і вытворчае ўпраўленне далі высокую ацэнку рабоце універсітэцкіх атрадаў, выносілі падзяку студэнтам за дапамогу, якую тыя аказалі будаўніцтву. «Спадзяёмся,— пісалі яны,— што студэнты-будаўнікі прыедуць да нас і ў наступны год».

З 1967 года студэнцкія будаўнічыя атрады хутка растуць колькасна, паляпшаецца арганізацыя і якасць работы, расшыраюцца рамкі іх грамадска-палітычнай дзейнасці. Так, у трэцім працоўным семестры 1968 года прымала ўдзел ужо 1300 студэнтаў універсітэта, аб'яднаных у 52 атрады. На будаўнічых пляцоўках Беларусі, Казахстана, Эстоніі, Цюменскай і Мурманскай абласцей яны асвоілі 1.347 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, пабудавалі 83 аб'екты.

Студэнцкая будоўля гартавала характары, выхоўвала волю, нараджала сваіх герояў. Па выніках працоўнага семестра-68 студэнты універсітэта А. Калеснік, П. Бондар, А. Кажэўнікаў былі ўзнагароджаны медалём «За асваенне цалінных і абложных зямель». Уменне дакладна арганізаваць работу атрадаў, з'яднаць і павесці за сабой студэнцкія калектывы паказалі І. Цвірко, А. Слука, А. Баброў, П. Пабока, Б. Марозаў і многія іншыя камандзіры лінейных СБА.

З'яўляючыся прадаўжальнікамі слаўных працоўных спраў камсамольцаў 30-х, 40-х гадоў, пакаральнікаў цаліны, юнакі і дзяўчаты ўдарна працавалі на буйнешых будоўлях Беларусі, Карэліі, Казахстана, Камчаткі, Комі АССР, Заходняй Сібіры. Яны ўзводзілі КАМаз, будавалі БАМ, працавалі ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, Народнай Рэспубліцы Балгарыі.

ГОД ад году ўзрастала колькасць зводнага студэнцкага атрада Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. У трэцім працоўным семестры 1974 года, прысвечаным 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна, 30-годдзю вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у саставе 59 атрадаў працавалі 1870 чалавек. Яны асвоілі 3.860 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.

Павелічэнне колькаснасці зводнага атрада, рост аб'ёмаў будаўнічых работ патрабавалі павышэння якасці падрыхтоўкі як байцоў, так і кіраўнікоў лінейных атрадаў. У 1974 годзе камітэт камсамола універсітэта пераходзіць да круглагадавой работы са студэнцкімі атрадамі. Былі вызначаны асноўныя этапы падрыхтоўкі СБА, распрацаваны комплекс арганізацыйных і выхаваўчых мерапрыемстваў, арганізавана сацыялістычнае спаборніцтва ў падрыхтоўчы і рабочы перыяды.

Пераход да круглагадавой падрыхтоўкі атрадаў абумовіў паяўленне новых форм працоўнага руху студэнцкай моладзі. У студзені 1975 года на базе гістарычнага факультэта быў створаны першы зімовы студэнцкі будаўнічы атрад (камандзір — У. Карагін, камісар — В. Мядзелец). На працягу двух тыдняў рабяты працавалі на будаўнічых пляцоўках трэцяга ўчастка праектна-мантажнага ўпраўлення «Мінскрадыёбуд». Будучыя кіраўнікі летніх студэнцкіх атрадаў А. Буры, М. Жаўно, А. Кішкевіч, М. Няхайчык, Г. Хухлындзін, С. Філімонаў і іншыя прайшлі ў зімовым СБА школу падрыхтоўкі да трэцяга працоўнага семестра. Бюро камітэта камсамола адобрыла практыку стварэння зімовых атрадаў. У 1979 годзе ва універсітэце было сфарміравана ўжо чатыры зімовыя СБА агульнай колькасцю 101 чалавек.

ВАЖНУЮ ролю ў павышэнні эфектыўнасці і якасці вытворчай дзейнасці атрадаў адыграў пераход СБА да доўгатэрміновага планавання сваёй работы. Першым з атрадаў, які заключыў доўгатэрміновы дагавор з прымаючай арганізацыяй, быў СБА «Буравеснік» (філфак). У 1971 годзе ён падпісаў дагавор з ПМК-37 трэста «Гомельводбуд» тэрмінам на пяць гадоў. Пяцігадовы вопыт работы атрада на практыцы паказаў перавагі доўгатэрміновых сувязей з прымаючымі арганізацыямі. За 1971 — 1975 гады на меліярацыі беларускага Палесся атрад «Буравеснік» асвоіў 323,5 тысячы рублёў капітальных укладанняў. Рукамі байцоў СБА было зроблена больш 50 кіламетраў меліярацыйнага канала. Кожны год абнаўляўся састаў атрада, аднак традыцыі яго захоўваліся. Рабяты перадавалі адзін аднаму вопыт работы, задоўга да прыезду байцоў на месца дыслакацыі кіраўнікі ПМК ведалі, што могуць рабяты, што трэба зрабіць для арганізацыі вытворчай і грамадска-палітычнай дзейнасці СБА. Не выпадкова па выніках сацыялістычнага спаборніцтва ў трэціх працоўных семестрах 1975 і 1976 гадоў атрад «Буравеснік» быў прызнаны адным з лепшых.

У 1979 годзе па доўгатэрміновых дагаворах працавала ўжо 23 атрады БДУ імя У. І. Леніна. Гэта садзейнічала укараненню прагрэсіўных форм працы, павышэнню эфектыўнасці і якасці работ.

Разам з удасканаленнем вытворчай дзейнасці СБА развівалася і другая асноўная функцыя атрадаў — грамадска-палітычная работа. Студэнцкі атрад не існуе без актыўнай агітацыйна-прапагандысцкай, культурна-масавай, шэфскай работы па месцу дыслакацыі, без рытуалаў і свят, фестываляў і спартыўных спаборніцтваў.

І цалкам апраўданы той жывы інтарэс, які праяўляюць мясцовыя жыхары да хлопцаў і дзяўчат у будатрадаўскіх куртках. У 1979 годзе, напрыклад, байцы зводнага СБА універсітэта ў працоўны перыяд прачыталі 1843 лекцыі, атраднымі агітбрыгадамі было дадзена 937 канцэртаў мастацкай самадзейнасці.

Вялікую ролю адыгрываюць студэнцкія атрады ў ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі. У перыяд працоўных семестраў байцы СБА прымаюць актыўны ўдзел у паходах па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа, экспедыцыі «Мая Радзіма — СССР», праводзяць сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і працы.

У 1978 годзе ва універсітэце на базе механіка-матэматычнага факультэта быў сфарміраваны камуністычны атрад імя Героя Савецкага Саюза А. Матросава. Узначаліў яго сакратар камітэта камсамола факультэта Аляксандр Казулін. Па праекту беларускага архітэктара В. Лагуноўскага байцы атрада збудавалі велічны манумент каля вёскі Чарнушкі Пскоўскай вобласці, дзе здзейсніў свой подзвіг камсамолец Аляксандр Матросаў. 22-метровым штыкам устала на лясной паляне стэла з барэльефам Героя Савецкага Саюза А. Матросава.

Гэтыя прыклады не адзінкавыя. Толькі ў трэцім працоўным семестры 1979 года студэнцкія атрады універсітэта пабудавалі і рэстаўрыравалі 104 помнікі і абеліскі.

Іменна ў будатрадах рос і мужнеў камсамольскі актыў універсітэта. Школу СБА прайшлі Міхаіл Ціва, Валерый Пракошын, Алег Слука, Уладзімір Навумовіч, Анатолій Тозік, якія ў розны час узначальвалі камсамольскую арганізацыю БДУ імя У. І. Леніна. На працягу трох гадоў намеснікам сакратара камітэта камсамола універсітэта з'яўляўся Уладзімір Сілін, узнагароджаны за работу ў студэнцкіх будаўнічых атрадах медалём «За працоўную адзнаку». У 1976 годзе Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за ўдарную працу ў СБА ордэнам Знак Пашаны быў узнагароджаны студэнт фізфака Леанід Семяненка — сакратар камітэта камсамола факультэта.

Такім чынам, студэнцкія атрады вырашаюць цэлы комплекс выхаваўчых задач, даюць магчымасць юнакам і дзяўчатам праявіць свае магчымасці, праверыць сілы ў практычнай дзейнасці. Выхаваўчае значэнне атрадаў заключаецца ў тым, што яны цесна спалучаюць, але ў той жа час падначальваюць асабістыя інтарэсы калектыўным, інтарэсам у дасягненні канчатковага выніку працы, якая атрымлівае грамадскае прызнанне. Валодаючы правам самастойна рашаць пытанні ўнутрыатраднага жыцця, вытворчай і грамадска-палітычнай дзейнасці, СБА садзейнічае фарміраванню ў студэнтаў адказных адносін да даручанай справы, выхоўвае ў рабят навыкі арганізатараў і кіраўнікоў калектываў

**П. БРЫГАДЗІН,**
**кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела прапаганды і агітацыйна-масавай работы ЦК ЛКСМБ, былы сакратар камітэта камсамола універсітэта.**

## ЛЕТАПІС БДУ

**(Пачатак у №№ 4, 6, 7, 8, 10, 11, 12, 13).**

**1954 год**
**Кастрычнік**

Мінскі юрыдычны інстытут пераўтвораны ў юрыдычны факультэт універсітэта. На стацыянары навучаецца 950 студэнтаў, на завочным аддзяленні 700. З 9 кафедр 5 уваходзяць у састаў агульнауніверсітэцкіх. На факультэце застаюцца кафедры: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права; дзяржаўнага і міжнароднага права; прававых дысцыплін; крымінальнага права і крымінальнага працэсу.

**Снежань**

Ва універсітэце навучаецца 3536 студэнтаў на стацыянары і 2538 студэнтаў на завочным аддзяленні, ёсць 46 кафедр, на якіх працуюць 298 навуковых супрацоўнікаў, у тым ліку 24 дактары навук і прафесары, 68 дацэнтаў, 115 кандыдатаў навук.

У 65 навуковых гуртках займаецца звыш 1 тысячы студэнтаў.

**1955 год**
**Лістапад**

Пры камітэце камсамола створана лектарская група. Пачатак работы студэнцкага лекторыя.

**1956 год**
**Чэрвень**

Адбыўся мітынг студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, на якім вырашана адправіць на цалінныя землі атрад камсамольцаў не менш чым 400 чалавек.

**16 верасня**

На вакзале адбылася сустрэча першай групы пасланцоў ВНУ горада, якія працавалі на ўборцы ўраджаю ў Казахстане.

**Кастрычнік**

На 7 факультэтах, 44 кафедрах працуе каля 300 чалавек, у тым ліку: 30 прафесараў, дактароў навук, 82 дацэнты, 67 выкладчыкаў — кандыдатаў навук, 96 выкладчыкаў і асістэнтаў без вучоных ступеней.

**23 лістапада**

У Тэатры оперы і балета адбылося юбілейнае пасяджэнне вучонага савета, прысвечанае 35-годдзю БДУ.

**1957 год**
**Студзень**

Студэнт гістарычнага факультэта П. Дземянчук перадаў у інстытут гісторыі АН БССР клад сярэбраных манет, знойдзеных у г. Камянцы Брэсцкай вобласці. Большасць манет адносіцца да другой паловы XVII стагоддзя.

**23 сакавіка**

Выступленне Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. І. Казлова на сустрэчы са студэнтамі БДУ.

**Сакавік**

Зварот калектыву Мінскага радыёзавода да калектыву фізіка-матэматычнага факультэта з прапановай аб супрацоўніцтве.

**3—11 жніўня**

Удзел студэнтаў БДУ ў саставе маладзёжнай дэлегацыі Мінска ў фестывалі моладзі Магдэбургскай акругі ГДР.

**17—24 верасня**

Па запрашэнню Беларускага таварыства культурных сувязей з заграніцай у Мінск прыбыла група студэнтаў і выкладчыкаў кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. Ва універсітэце адбыўся вечар, прысвечаны сустрэчы беларускіх і польскіх студэнтаў.

**(Працяг будзе).**

● ПАТРАБУЕ РАШЭННЯ

# НЕ ЎМЕЕМ І НЕ ХОЧАМ

КОЖНЫ дваццаты студэнт універсітэта ўзяты на дыспансерны ўлік. Гэта насцярожвае і прымушае актывізаваць работу па прадухіленню і памяншэнню захворванняў. З гэтай мэтай існуе спартыўна-аздараўленчая камісія пры прафкоме БДУ. Яе галоўная задача — актывізацыя спартыўна-аздараўленчай работы на факультэтах, у інтэрнатах, прапаганда масавых відаў спорту.

Усе ведаюць, што спорт — здароўе, сіла. Але, як правіла, займаюцца спортам толькі разраднікі, ды тыя студэнты, у якіх у вучэбнай сетцы адведзены гадзіны фізкультуры. А астатнія? На стадыёне, ля інтэрнатаў, дзе мы жывём, можна ўбачыць іх не многа, хаця аб значэнні спорту ведаюць усе. Слаба наладжана спартыўная работа ў інтэрнатах, хоць і існуюць адказныя ў студсавеце за спартыўныя мерапрыемствы.

Возьмем лекцыі на санітарна-гігіенічныя тэмы. Прыходзяць на іх кампетэтныя людзі, спецыялісты, але вельмі часта жаданай аддачы лекцыі не дасягаюць.

80 пуцёвак у міжвузаўскі санаторый - прафілакторый выдзяляе БПІ Белдзяржуніверсітэту. Дыспансерныя хворыя маюць права два разы ў год пабываць там, а іншыя студэнты — раз. Аднак на кожным факультэце адзін і той жа малюнак: усе хочуць паехаць адразу ж пасля канікулаў, утвараецца нават нешта накшталт чаргі. А вось у перыяд сесій колькасць заяў рэзка зніжаецца. Адна з галоўных прычын гэтага — адсутнасць памяшканняў для заняткаў.

Нераўнамерна паступаюць заявы і на лячэнне ў санаторыі, дамы адпачынку. Сталі сістэмай папкі заяў на летні перыяд і малая колькасць іх у час вучэбнага семестра. Прыходзіцца часам амаль упрошваць студэнтаў ехаць на лячэнне, хаця дэканаты факультэтаў ахвотна ідуць на ўсе ўступкі.

Дыета — таксама лячэнне, і асабліва для студэнтаў са страўнікава - кішэчнымі захворваннямі. Малюнак зноў жа сумны: дыетхарчаваннем карыстаюцца лічаныя людзі. На факультэтах журналістыкі і юрыдычным талоны не бяруць з-за таго, што дыетхарчаванне арганізавана ў сталовай на плошчы Леніна, а ў студэнтаў іншы раз бывае і чатыры пары заняткаў, час знайсці цяжка. Святлана Мароз, старшыня спартыўна - аздараўленчай камісіі, лічыць, што яго можна арганізаваць для гэтых факультэтаў у сталовай на журфаку.

— Усё залежыць ад прафорга, — працягвае Святлана. — Прафорг павінен клапаціцца аб сваёй групе. Работа яго не заканчваецца зборам прафсаюзных узносаў ці грошай на праязныя білеты. А чаму б не сабраць групу, а то і агульны факультэцкі сход, пагаварыць аб сваім здароўі, аб тых ільготах, якія прадастаўляюцца нам, студэнтам. Тут яшчэ патрэбна і індывідуальная работа з кожным. Для чаго ж існуюць спартыўна - аздараўленчыя камісіі факультэцкіх прафбюро? І наогул, мы не ўмеем выкарыстоўваць тое, што нам даецца, проста не ведаем сваіх правоў і магчымасцей.

**А. АЎРУСЕВІЧ,**
**член прэс-цэнтра прафкома.**

ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА

# «У ПАЛОНЕ ІНЕРЦЫІ»

**25 СНЕЖНЯ 1980 ГОДА Ў ГАЗЕЦЕ БЫЎ НАДРУКАВАНЫ АРТЫКУЛ «У ПАЛОНЕ ІНЕРЦЫІ» [АЎТАР М. ЛАХВІЧ] АБ РАБОЦЕ СТУДЭНЦКАГА САВЕТА ІНТЭРНАТА № 2. АРТЫКУЛ АБМЕРКАВАНЫ НА ПАСЯДЖЭННІ СТУДСАВЕТА ІНТЭРНАТА.**

**НА ПАСЯДЖЭННІ АДЗНАЧАЛАСЯ, ШТО ФАКТЫ, ЯКІЯ АПІСАНЫ Ў МАТЭРЫЯЛЕ, МЕЛІ МЕСЦА.**

«У цяперашні час на паверхах абсталяваны бытавыя памяшканні. Жыхары па меры магчымасці забяспечаны інвентаром. Неаднаразова перад дырэкцыяй студэнцкага гарадка і прафкомам універсітэта ставілася пытанне аб незабяспечанасці некаторых пакояў санабсталяваннем. Зараз гэтае пытанне студсавет вырашае сумесна з прафбюро фізічнага факультэта.

На 12 паверсе функцыяніруе пакой інтэрнацыянальнай дружбы, на 8 і 6 паверхах афармлены ленінскія пакоі, дзверы якіх адкрыты штодзённа для жыхароў і гасцей інтэрната. Ідзе афармленне стэндаў па матэрыялах XXVI з'езда КПСС.

Новы адказны за дзяжурства А. Сівакоў і ўвесь студсавет прыклалі нямала намаганняў, каб вырашыць пытанне аб дзяжурстве на паверхах. У выніку сумесных намаганняў якасць і ўзровень дзяжурства палепшаны.

Студсавет актыўна дапамагае каменданту інтэрната ў рашэнні шматлікіх гаспадарчых пытанняў».

**В. САЎЧУК,**
**старшыня студсавета інтэрната № 2.**



Вясна, канспект і сонейка...

Фотаэцюд В. ШАЧАКА.

● СПОРТ ●

● РАСКАЖУ ПРА ТАВАРЫША

# КАПІТАН

У ВЯЛІКІМ люстэрку гімнастычнай залы бачны хуткія выразныя рухі гімнасткі. Трыо — Ірына, музыка і чырвоная стужка — малявала карцінку вясёлага зялёнага луга.

Узмах рукі — і стужка-вясёлка супакойваецца каля ног гімнасткі. Практыкаванне закончана. І, нягледзячы на тое, што за акном пахмурны дзень, у Ірыны Бялейчык на твары шчаслівая ўсмешка.

Можна адпачыць. Я падыходжу да Ірыны, знаёмімся. Праз некалькі хвілін яна ўжо расказвае:

— Так, на волі і настойлівасці ўсё трымаецца. Ужо адзінаццаты год я прыходжу ў гімнастычную залу. Бывае вельмі цяжка. Але любоў да гімнастыкі і ўважлівы добры трэнер Валянціна Васільеўна Сяўбо дапамагаюць. І ад гэтай працы адчуваеш задавальненне.

Нядаўна прымала ўдзел ва ўсесаюзных спаборніцтвах па мастацкай гімнастыцы сярод мацнейшых універсітэцкіх каманд краіны. Усе, хто выступаў на іх, былі добра падрыхтаваны, паказвалі цікавыя, а самае галоўнае, складаныя практыкаванні. І мне, капітану каманды БДУ, вельмі прыемна — мы былі трэцімі. Гэта тым больш радуе, што ў мінулым годзе мы не падняліся вышэй пятага месца.

1980 год быў для Ірыны Бялейчык знамянальным. Яна стала майстрам спорту СССР па мастацкай гімнастыцы і студэнткай 1-га курса факультэта журналістыкі БДУ. Спорт і вучоба пераплеліся ў жыцці дзяўчыны. Першую сесію яна здала добра. Аднакурснікі паважаюць яе не толькі як майстра спорту і старанную студэнтку, але і як добрага сябра.

А сёлета Ірына разам са сваімі сяброўкамі будзе трымаць цяжкі экзамен. У жніўні ў Мінску адбудзецца ўсесаюзнае першынство па мастацкай гімнастыцы.

...Закончылася яшчэ адна трэніроўка. Дзяўчаты хуценька разыходзяцца дамоў. Бо наперадзе — падрыхтоўка да лекцый і практычных заняткаў.

**А. БЛІНЕЦ,**
**студэнтка журфака.**



У гімнастычнай зале БДУ імя У. І. Леніна.

Фота В. ШАЧАКА.

● СПОРТ ●

# ЭКСПРЭС-ІНФАРМАЦЫЯ

● БАСКЕТБОЛ ●

У чарговых спаборніцтвах па баскетболу сярод каманд замежных студэнтаў, уключаных у праграму VII спартакіяды г. Мінска, перамагла зборная БДУ. У фінале яна сустрэлася з камандай БПІ. У састаў універсітэцкай зборнай увайшлі: Эмілія Перэс, Андрэас Лас, Франсіска Гарсія, Раберта Сантана, Луіс Фуэнтэс, Эрмак Дзімаў, Хорхе Гансалес, Клод Афан.

Напомнім, што пасля трох відаў (лыжы, баскетбол, валейбол) спартсмены БДУ ўваходзяць у тройку мацнейшых (усяго пяць каманд). Наступныя спаборніцтвы сярод каманд замежных студэнтаў пройдуць у зале філалагічнага факультэта, дзе высвятліцца пераможца па настольнаму тэнісу.

● ШАХМАТЫ ●

Працягваецца каманднае першынство універсітэта па шахматах. Пасля шасці тураў месцы сярод факультэцкіх зборных размеркаваліся наступным чынам (у дужках — колькасць набраных ачкоў):

1. **Хімфак [24,5]**
2. **Мехмат [21,5]**
3. **Фізфак [20,5]**
4. **Юрфак [19]**
5. **Філфак [18]**
6. **Радыёфізікі і электронікі [16,5]**
7. **ФПМ [15,5]**
8. **Гістфак [15]**
9. **Журфак [8,5]**
10. **Біяфак [6]**

**С. ЛЫСКАВЕЦ.**

«ПРАЛЕСКА»

Так называецца футбольны турнір, які арганізаваны на журфаку на прыз насценнай газеты «Журналіст». Чатыры каманды — прадстаўнікі курсаў — памераюцца сіламі ў барацьбе за ганаровы прыз. Такія турніры на факультэце праводзяцца штогод.

**П. ЦУНІК.**

● СПОРТ ●


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

9 красавіка 1981 г.

Заказ 629. АТ 02177

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ